## **“Зводны каталог усходніх рукапісаў XIV–XX стст.” (2005–2011 гг.)**

Нацыянальная бібліятэка Беларусі валодае каштоўнай калекцыяй ўсходніх манускрыптаў у арабскай графіцы, разнастайнай па мовах, тэматыцы, жанрах, вонкавым выкананні (31 спіс). 6 спісаў таксама захоўваецца ў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэцы імя У.І. Леніна. Аснову калекцыі складаюць манускрыпты са збору кніжных рэдкасцей графа І.Ф. Паскевіча (1782–1856). Гэта ўнікальныя помнікі кніжнай культуры Усходу, самы ранні з якіх датуецца 1377 г. Сярод аўтараў твораў, каментатараў, перакладчыкаў, перапісчыкаў імёны шырока вядомых і аўтарытэтных дзеячаў ісламскага Сярэднявечча. На аркушах большасці манускрыптаў захаваліся запісы і ўладальніцкія пячаткі. Мэта навуковага праекта – захаваць, увесці ў навуковы абарот і зрабіць даступнымі малавывучаныя і раней невядомыя творы пісьмовай спадчыны ісламскага свету, якія захоўваюцца ў бібліятэках Беларусі. У рамках праекта падрыхтаваны да друку зводны каталог арабскіх, персідскіх і турэцкіх рукапісаў XIV–XIX стст. з фондаў беларускіх бібліятэк і ў якасці дадатку да каталога – тэксты найбольш цікавых у навуковым плане манускрыптаў калекцыі. Каталог уключае поўную характарыстыку асобнікаў калекцыі, як іх знешніх прыкмет, так і зместу.